# СЦЭНАРЫЙ МЕРАПРЫЕМСТВА ДА ДНЯ БЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

*-Гучыць этнічная музыка. На пляцоўку перад школай праходзяць дзеці з эмблемамі гарадоў, дзе ў свой час праходзіла свята беларускага пісьменства. Яна падымаюцца на ганак школы і размяшчаюцца на прыступках ганка.*

*(Дэманстрацыя слайдаў на экране "Дзень беларускага пісьменства", знакавых месцаў Беларусі, выяў тых гарадоў, дзе праходзіла свята)*

-Музычны нумар.

*(на экране пейзажы Беларусі, памятныя мясціны, сімвалы Беларусі)*

Выходзяць вядучыя.

**Вядучы 1** -Дзень добры ўсім, хто завітаў на наша свята кнігі, свята беларускага пісьменства.

**Вядучы 2** -Прывітанне, Івацэвічы!

**Вядучы 1** -Ужо не першае дзесяцігоддзе наша краіна адзначае Дзень беларускага пісьменства, свята, якое яднае нас, беларусаў увагай да такіх спрадвечных сімвалаў духоўнага жыцця, як кніга і слова.

**Вядучы 2** -Слова, у якім захавана наша шматвекавая гісторыя, наша народная мудрасць, наша культура.

**Вядучы 1** -Слова, якое мы павінны зберагчы і перадаць сваім нашчадкам.

**Вядучы 2** -Унікальнасць Дня беларускага пісьменства у тым, што кожны год гэта свята мяняе сваю прапіску, свае сталіцы, якімі ўжо былі Навагрудак і Нясвіж, Орша і Піск, Мсціслаўль і Мір, Камянец і Паставы, Шклоў і Барысаў, Смаргонь і Хойнікі, Ганцавічы і Глыбокае, Быхаў і Шчучын, Рагачоў і Іванава, Слонім і Бялынічы.

**Вядучы 1** -Цэнтрамі правядзення свята ўжо неаднаразова былі Полацк і Тураў…..

**Вядучы 2** -Ва ўсіх гэтых гарадах на доўгія гады засталіся не толькі яркія ўспаміны пра тайную веліч слова, але і шматлікія абноўленыя аб'екты культуры, сацыяльнай сферы, помнікі дойлідства, якія мацуюць нашу гістарычную спадчыну, робяць наша жыццё духоўна эмацыянальным, напоўненым і асэнсаваным.

**Вядучы** 1 -А сёлета цэнтрам урачыстых мерапрыемстваў рэспубліканскага значэння стане горад Копыль.

**Вядучы 2** -Далучаемся да гэтага свята і мы, свята, на якім у цэнтры ўвагі КНІГА.

**Вядучы 1** -Для яе ў нас ганаровае месца вось на гэтай імправізаванай палічцы. І палічка гэтая будзе папаўняцца кнігамі на працягу ўсяго нашага мерапрыемства.

**Вядучы 2** -Вельмі цяжка ўявіць свята без гасцей. І да нас сёння завіталі…….

**Вядучы** 1 -Слова мае….

(Музычны нумар)

**Вядучы** 2 -Наша свята працягваецца. (*выбягае Алесь)*

**Алесь:** -Мама! Тата! Я толькі што зразумеў, што ў мяне могуці быць непрыемнасці ў школе!

**Вядучы 2** -Што здарылася, сонейка маё?

**Маша** -Я не прачытаў усе кнігі, якія нам рэкамендавалі на лета.

**Вядучы** 1 -Так. І чаму?

**Маша** -Іх вельмі шмат! Ды і навошта?

**Вядучы** 2 -Як гэта “навошта”?А адкуль жа браць веды?

**Маша** -З Інтэрнэта! Там усё ёсць!

**Вядучы** 2 -Ох, ужо гэты Інтэрнэт!

Выходзіць бабуля, звяртаецца да бацькоў:

-Ну, што? Давыхоўваліся? Не чытае кніжак і не хоча? Давайце я паспрабую.
-(паварочваецца да унука: Сонейка маё, а ты хочаш падарожнічаць у часе і прасторы?

**Алесь:** - На машыне часу? А як жа! Хачу!

**Вядучы** 1 -А ведаеш, каб гэта зрабіць, трэба толькі ўзяць кніжку, разгарнуць яе і…падарожжа пачалося! Ты можаш трапіць і ў Сярэднявечча, і зазірнуць у будучыню, паблукаць на Поўначы сярод белых мядзведзяў альбо трапіць у пустыню…

**Алесь:** -Цікава. Але кніг жа так многа. Як выбраць тую, якая патрэбна?

**Вядучы** 2 -Гэта магчыма. Для гэтага ў нас ёсць цудоўныя дарадцы. І, дзякуючы тэлебачанню, мы можам пачуць іх парады. Звернем нашу ўвагу на экран.

***(дэманстрацыя відэа, вынас кніг на палічку)***

**Вядучы** 2 -Вось так і атрымліваецца, што не толькі ў нас, у дарослых, не хапае на ўсё часу, але і ў нашых дзяцей таксама. Яны робяць вывады, высновы, прачытаўшы скарочаны варыянт кнігі.

**Вядучы** 1 -Якія, між іншым, рыхтуем для іх мы, дарослыя.

**Вядучы** 1   - Вось ведаеш, Таня, калі я вучыўся ў школе, для мяне не было ніякай розніцы, тоўстая кніга ці не. Галоўнае, каб яна была цікавая. Помню, што кнігу Міхася Лынькова “Міколка-паравоз” я прачытаў менш, чым за дзень.

**Вядучы** 2 -Ну, знайшоў мне тоўстую кнігу!

**Вядучы** 1 -Але ж цікавую!

**Вядучы** 2 - А вось мне вельмі падабаліся творы Янкі Маўра. Асабліва яго “Палескія рабінзоны”. А ты іх чытаў?

**Вядучы** 1 -Ну, зразумела, чытаў.

**(*Выходзяць дзеці з ранцамі за плячыма)***

**Вядучы** 2 - А я вось гляджу, што наш сынок ідзе, ды і не адзін, а ў суправаджэнні цудоўнай паненкі. Дзень добры! Алеська, хто гэта з табой?

**Алесь:-** Гэта  мая новая сяброўка Женечка з паралельнага класа.

**Алесь**: Добры дзень. Я Жэня. Вельмі прыемна пазнаёміцца.

**Вядучы** 1 -І нам таксама. А куды вы сабраліся?

**Жэня:-** Мы сабраліся ў паход. Мы марым стаць касманаўтамі.

**Вядучы** 1 -Так, нешта я не вельмі разумею, як суадносіцца паход і касманаўтыка.

**Жэня:** -Да экстрэмальных сітуацый трэба рыхтавацца загаддзя.

**Вядучы** 2 -Спадзяюся, вы ўжо вырашылі, якія кнігі возьмеце ў космас?

**Дзеці (разам):** Не!!!

**Вядучы** 1 -Я нават і не ведаю, што вам параіць.

**Вядучы** 2 -А давайце паслухаем нашых экспертаў. Увага на экран.

**(Дэмантрацыя відэа)**

**Вядучы** 1 -А помніш нашу першую сустрэчу?  Каля бібліятэкі.

**Вядучы** 2 -А як жа! Быў май. Цвіў бэз. Ты чытаў зборнічак Максіма Багдановіча.

**Вядучы1**  -Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла…

**Вядучы** 2  -Цудоўны верш! А ведаеш, што ў гэтым годзе мы будзем адзначаць 130-годдзе з Дня яго нараджэння? Юбілейная дата.

**Вядучы** 1 – Так. І не толькі ў Багдановіча! Юбілейным гэты год будзе і для многіх іншых паэтаў і пісьменнікаў: Віталя Вольскага і Міхася Чарота , Міхася Зарэцкага і Георгія

Марчука, Алеся Звонака і Міхася Стральцова, Алеся Гаруна  і Алеся Жука, Раісы Баравіковай, Янкі Брыля і Пімена Панчанкі, Янкі Купалы і Якуба Коласа.

***(музычны нумар/верш) вынас кніг паэтаў-юбіляраў***

**Вядучы** 2 -За гады незалежнасці ў нашай краіне вырасла новае пакаленне дзяцей-беларусаў. Яны ходзяць у бібліятэкі, перамагаюць у спартыўных спаборніцтвах, займаюць прызавыя месцы на міжнародных алімпіядах, конкурсах.

**Вядучы** 1-А некаторыя мараць стаць не толькі касманаўтамі, але і дактарамі, настаўнікамі, паэтамі, пісьменнікамі. Хто ведае, можа, і сярод прысутных  сёння на нашым свяце ёсць свае Купалы, Коласы, Макаёнкі, таму што Івацэвіччына, як і ўся Беларусь, багатая на таленты.

**Вядучы** 2 -А нашу палічку папаўняюць кнігі нашых землякоў: Валерыя Гапеева, Яраслава Пархуты, Алеся Зайкі, Віктара Рэчыца, Анатоля Галушкі і іншых паэтаў.

**Вядучы** 1 -Я ўпэўнены, што мары нашых дзетак спраўдзяцца.

**Вядучы** 2 -А я хачу падзякаваць усім, хто пакінуў на нашай паліцы свае падарункі-кнігі, якія мы перададзім у школьную бібліятэку.

*Выходзіць бабуля*

**Бабуля:** -Ну. А ты, Алеська,  якую кнігу выбраў сабе пачытаць?

**Алесь:**  -Я выбраў нават не адну, а некалькі!

**Бабуля**: -Як не адну? Нешта я не бачу ні адной у цябе.

**Алесь:**  -Дык я ж дзіця прагрэсу! Я спампаваў іх на свой планшэт. Буду чытаць іх у электронным варыянце. Тут у мяне і казкі, і вершы Багдановіча, якія так любіць тата, і нават “Псалтыр” Скарыны.

**Бабуля**: -Ах ты, гарэза! Малайчына. (*Цалуе ўнука*). Чытаць трэба і электронныя кніжкі, і друкаваныя. Галоўнае - чытаць.

**Вядучы** 2 -Вось яно, маладое пакаленне. Менавіта для яго назапашаны вялікі скарб у нашых кнігах. І я ўпэўнена, што нашы дзеці, а потым і ўнукі ўпішуць у гэты летапіс свае слаўныя радкі.

**Вядучы**1 -І гэтыя радкі будуць складвацца ў новыя вершы, кнігі і песні.

*Фінальная песня (“Синеокая”/“Беларусы мы”)*